**Змест, этапы і метады азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з народнай цацкай**

Педагагічныя даследаванні вядомых навукоўцаў па пытаннях выкарыстання народнай цацкі ва ўстанове дашкольнай адукацыі (А.П. Вусава, А.Я. Флёрына, А.С. Найдзен, В. У. Абраменкава і інш.) арыентуюць на тое, што ***народная цацка павінна выступаць у педагагічным працэсе як тып мастацкай творчасці, які спалучае ў сабе матэрыяльныя і духоўныя дасягненні.*** Фарміраванне ведаў аб ёй павінна ажыццяўляцца на аснове ўспрымання дзецьмі пазнавальнага, эстэтычнага, маральнага, эмацыянальнага зместу, адэкватнага разумення яе культурна-гістарычнага значэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сучасныя даследаванні беларускіх навукоўцаў у галіне педагагічнай навукі і мастацтвазнаўства настойваюць на тым, што ***мастацтва беларускай народнай цацкі з'яўляецца асаблівым тыпам мастацкай творчасці, якая інтэгруе ў сябе розныя віды народнага мастацтва, аб'ядноўвае матэрыяльныя і духоўныя здабыткі беларускай культуры, пацвярджае таленавітасць нашага народа.*** Выкарыстанне яе ў дзейнасці устаноў дашкольнай адукаці на занятках па выяўленчым мастацтве і мастацкай працы, пад час азнаямлення з беларускім славесным фальклорам і мастацкай літаратурай спрыяе фарміраванню творча-актыўнай асобы, якая будзе прадаўжальнікам народных традыцый (Б.М. Маршак, В.А. Сілівон, Л.Б. Гаруновіч, Т.Б. Брацкая, Д.М. Дубініна і інш.).

Першая сустрэча дзіцяці з народнай цацкай (у сучасным выкананні) можа адбыцца ўжо ***на першым годзе жыцця***. Дарослы выкарыстоўвае ў зносінах з дзіцем народныя цацкі, якія яно можа бачыць, чуць, да якіх можа дакранацца, абмацоўваць, стукаць, трэсці, качаць, перакладваць, падкідваць,нюхаць, што спрыяе як агульнаму развіццю немаўляці, так і развіццю яго органаў успрымання, руху і маўлення. Размяшчаць цацкі і прадметы (бразготкі, малаточак, званочак, пішчалікі) неабходна ў межах

дасягнутасці дзіцяці з мэтай фарміравання здольнасці да каардынацыі і адвольнасці рухаў.

Ужо ў гэтым узросце трэба заахвочваць дзяцей да актыўнага маніпулявання з цацкамі пад час знаходжання ў манежы: цягнуць да сябе бразготку ці іншую цацку, складваць цацкі ў кошык, абуваць ці разуваць ляльку, апранаць ці распранаць яе, катаць мячы ці драўляныя шары па падлозе (індывідуальна, парамі ці ў крузе разам з выхавальнікам).

У ***другой групе ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў)*** дарослы працягвае выхоўваць у малых цікавасць да гульняў, разнастайных дзеянняў з народнымі цацкамі. Задавальняе імкненне дзіцяці выкарыстоўваць новыя прадметы і цацкі: казачных звяроў, стужак, хустачак, палачак, кубікаў; шумавых цацак, атрымліваць асалоду ад музычнага гучання цацачных інструментаў (бубна, малаточка, барабанчыка, цымбал, дудачкі, свістка і інш.). Заахвочвае дзяцей да актыўнай дзейнасці і камунікатыўных зносін з народнымі цацкамі.

Развівае уяўленні пра народную цацку, звяртае ўвагу на колер цацкі, форму, часткі, гукі, якія тая падае (курка Рабка, вежачкі, грыбочкі, конікі і інш.). Дзеці пачынаюць заўважаць  у народных цацках як рацыянальны змест,так і непасрэдную прыгажосць

**У *першай малодшай групе (ад 2 да 3 гадоў)*** педагог стымулюе пазнавальную актыўнасць дзяцей пад час выканання розных дзеянняў са знаёмымі цацкамі  і новымі. Для гэтага пажадана забяспечыць індывідуальны выбар цацак дзецьмі (іх павінна быць у дастатковай колькасці на кожнае дзіця), каб пазбягаць канфліктаў і палегчыць адаптацыю дзяцей пры пераходзе з групы ранняга ўзросту ў малодшую (або з сям'і ва ўстанову дашкольнай адукацыі).

Педагог  прыцягвае ўвагу дзяцей да народных цацак, разглядвае з імі гліняныя свістулькі, драўляныя распісаныя вобразныя цацкі, звяртаючы ўвагу на сродкі мастацкай выразнасці. Падтрымлівае праяўленні цікавасці да народнай цацкі і жаданне гуляць з ёю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мэтазгодна пазнаёміць малых і з разнастайнымі цацкамі, якія адлюстроўваюць прылады працы, іншыя прадметы побыту (лапаткі, граблі, коўшыкі і да т.п.). Для задавальнення гульнявых патрэб малых і для развіцця іх агульнай сацыяльнай актыўнасці пажадана выкарыстоўваць у зносінах з дзецьмі музычныя інструменты: скрыпкі, дудачкі, свістулькі, цацкі-пішчалкі, гліняныя свістулькі ў выглядзе птушак.

Карысна развіваць ўспрыманне, наглядна-дзейнаснае і наглядна-вобразнае мысленне дзіцяці падчас індывідуальных дзеянняў з кубікамі, цаглінкамі, драўлянымі малаточкамі, цацачным посудам і г.д.

Неабходна прапаноўваць малым для гульні народныя цацкі-лялькі: хлопчык, дзяўчынка. Цацкі-лялькі могуць быць без твараў, выраблены з тканіны, але з выразнымі фігурамі і ў сапраўдным беларускім уборы.

У гэтым узросце педагог садзейнічае развіцццю групавых і калектыўных форм гульні, выкарыстоўваючы адначасова некалькі цацак.

Важна заахвочваць дзяцей прагаворваць свае ўражанні пад час гульняў, стымуляваць дзяцей каменціраваць гульнявыя дзеянні простымі сказамі накшталт: "Я гуляю, я - маці", "У лялькі - туфлікі", "Я калышу ляльку".

У змест азнаямлення выхаванцаў ***другой малодшай групы (ад 3 да 4 гадоў)*** з народным мастацтвам уваходзіць фарміраванне ў іх уяўленняў пра вырабы дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва: тканыя і вышытыя вырабы (абрусы, ручнікі), прадметы побыту (міскі, вазы, дэкаратыўныя талеркі), вырабы з саломкі, лёну, лазы.

У гэтым рэчышчы адбываецца знаёмства дзяцей з цацкамі як творамі народнага мастацтва: цацачным посудам, глінянымі і драўлянымі фігуркамі жывёл і птушак ( баран, конік, козлік, качка, певень, мядзведзь), чалавека; лялькай з анучы і саламянай лялькай.

Задача педагога – выкарыстоўваць народныя цацкі для развіцця ў малых пазнавальных інтарэсаў, пачуцця прыгажосці, колеру, мастацкага густу і жадання да актыўных дзеянняў з імі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паказваць цацкі трэба пры чытанні твораў вуснай народнай творчасці, выкарыстоўваць у гульнях, на занятках па выяўленчай дзейнасці. Дзеці чацвёртага года жыцця з цікавасцю разглядваюць народныя цацкі, бавяцца свістулькамі, іграюць на дудачцы. Такія заняткі добра суправаджаць чытаннем твораў беларускага фальклору, народнымі карагоднымі гульнямі з выкарыстаннем гэтых цацак.

Дзяцей ***сярэдняй групы*** педагог можа пазнаёміць з вялікай колькасцю цацак, прыцягваючы дзяцей да выкарыстання іх у гульні, выкарыстоўваючы цацкі на занятках. Так, можна выкарыстоўваць цацачны посуд для творчых гульняў дзяцей (гаршчочкі, збаны, міскі).

Дзеці гэтага ўзросту ахвотна малююць нескладаныя ўзоры, якімі ўпрыгожаны беларускія народныя цацкі. Таму на занятках па выяўленчым мастацтве пажадана вучыць іх маляваць па матывах народных цацак; распісваць глечыкі, збаны, гаршкі і інш. на плоскіх папяровых формах, якія імітуюць прадметы побыту.

Дзеці з задавальненнем вучацца ляпіць дэкаратыўны посуд па матывах беларускіх народных промыслаў, упрыгожваць посуд арнаментам. У аплікацыі ўпрыгожваць сілуэты посуду дэкаратыўнымі беларускімі элементамі.

Знаёмства з народнай цацкай педагог плануе і ў паўсядзённым жыцці, калі звяртае ўвагу дзяцей на тую ці іншую цацку, якая ёсць у групе установы дашкольнай адукацыі, прапануе ўважліва яе разглядзець, сам распавядае і заахвочвае дзяцей да выказвання ўласных уражанняў і разважанняў пра цацку.

**У *старэйшай групе (ад 5 да 6 гадоў)*** працягваецца знаёмства дзяцей з вырабамі дэкаратыўна-прыкладного мастацтва: тканыя і вышытыя вырабы (абрусы, ручнікі, адзенне); кераміка (міскі, вазы, гарлачыкі-спарышы і іншы традыцыйны беларускі посуд, цацкі); вырабы з саломкі, лёну, лазы (лялькі, звяры, птушкі, дэкаратыўныя талеркі, кошыкі і г. д.); вырабы з дрэва,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

упрыгожаныя разьбой, размалёўкай, саломкай (шкатулкі, пано і інш.), беларускі народны касцюм.

Педагог пашырае веды дзяцей аб розных відах цацак: драўляныя, гліняныя (паліваныя і непаліваныя), саламяныя, анучныя. Знаёміць з майстрамі дзіцячай народнай цацкі.

Педагог расказвае пра цацачны посуд (драўляныя і гліняныя гаршчочкі-спарышы, міскі, вядро, дзежачку і інш.), стол, лаву, ложак, куфар, заахвочваючы малых выкарыстоўваць іх у гульнях. Старэйшы дашкольны ўзрост спрыяльны для азнаямлення дзяцей механічнымі драўлянымі цацкамі: пільшчык, кавалі і да т.п. Дзеці не толькі любяць гуляць з імі, але і зацікаўліваюцца спосабам прывядзення фігурак у рух.

Як і раней, важна выкарыстоўваць народныя цацкі для творчых гульняў.

Педагог ужывае ў рабоце з дзецьмі дзіцячыя музычныя цацкі - інструменты (цымбалы, барабан, гармонік) падчас забаў і святочных ранішнікаў. Выхоўвае дапытлівасць і беражлівыя адносіны да цацак.

Працягваеццца знаёмства дзяцей са спосабамі вырабу некаторых народных цацак, у прыватнасці лялек. Паглыбляюцца навыкі працы з паперай і кардонам, навыкі вырабу разнастайных прадметаў, цацак з рухомымі часткамі (вазок, млынок) з наступным іх выкарыстаннем у гульнявой дзейнасці. Неабходна выхоўваць жаданне сумесна з дарослымі вырабляць самыя простыя цацкі.

На занятках па выяўленчым мастацтве дзеці вучацца сіметрычна размяшчаць раслінныя элементы арнаментаў  на плоскіх сілуэтах вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (адзенне, посуд, цацкі); падбіраць колеры, характэрныя для беларускага мастацтва. (прыблізная тэматыка: керамічныя цацкі: баран, конік, пеўнік і інш.)

Педагог вучыць выхаванцаў ляпіць декаратыўных птушак, качак, мядзведзікаў (з цэлага кавалка гліны), выразаць прадметы сіметрычнай формы са згорнутай напалову паперы: посуд ( кубак, збан), цацкі, элементы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларускай выцінанкі Неабходна развіваць дзіцячую творчасць па матывах народнага мастацтва: лепка посуду, маляванне цацкі з упрыгожваннем арнаментам і інш. Лепка дэкаратыўных талерак, місак, глечыкаў, коўшыкаў, абярэгаў у выглядзе птушак, звяроў, каней, з наступным расфарбаваннем.

Выхаванцы старэйшага ўзросту могуць навучыцца складаць апавяданне або загадку пра народную цацку.

Пачатая справа працягваецца **з дзецьмі *ад 6 да 7 гадоў.*** Дзеці знаёмяцца з *дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам:* тканымі і вышытымі вырабамі, керамікай, вырабамі з саломкі, лёну, лазы, з дрэва, беларускім народным касцюмам, а таксама творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва іншых народаў.

Выхаванцы з дапамогай педагога шырэй знаёмяцца з рознымі відамі цацак, гістарычнымі аспектамі іх вырабу, традыцыйнымі асаблівасцямі. Педагог выхоўвае ў дзяцей паважлівыя адносіны да майстроў цацак.

У дзяцей сёмага года жыцця неабходна выхоўваць жаданне вырабляць самыя простыя цацкі (гліняны посуд. птушак). У супрацоўніцтве з дарослымі вырабляць мяккія цацкі, лялькі з саломы, а таксама вучыцца вышываць лялечную вопратку.

На занятках па выяўленчым мастацтве працягваецца фарміраванне ў дзяцей уменняў дзеці вучацца падбіраць абмежаваную гаму колераў па матывах беларускай керамікі, падбіраць колеры для роспісу.

Педагог заахвочвае выхаванцаў да стварэння творчых кампазіцый па матывах беларускіх роспісаў, творчых работ па матывах беларускай керамікі: лепка глечыка, макітры і інш. з наступным іх расфарбаваннем. Ён падтрымлівае дзіцячую актыўнасць і творчасць у гульнявой дзейнасці са знаёмымі цацкамі. Дзеці складаюць загадкі пра народную цацку, апісваюць яе, параўноўваюць народныя цацкі паміж сабой.

У дзіцячым садзе мэтазгодна арганізаваць цэнтр, дзе захоўваюцца калекцыі беларускіх народных цацак, праводзяцца выставы. У гэтым цэнтры зацікаўленыя выхаванцы могуць атрымаць навыкі вырабу народнай цацкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У практыцы дашкольнай адукацыі нашай краіны назапашаны дастаткова багаты вопыт выкарыстання беларускай традыцыйнай цацкі ў align="left">рознабаковым выхаванні дзяцей. Гэты вопыт паказвае, што знаёмства дзяцей з народнай цацкай можа ажыццяўляцца рознымі шляхамі. Метады і прыёмы працы з беларускай цацкай у дзіцячым садзе павінны ўзгадняцца з імправізацыйным стылем працы народных майстроў і асаблівасцямі дзіцячай творчасці.

Можна вылучыць тры арганічна звязаных паміж сабой этапаў працэсу азнаямлення дзяцей з народнай (нацыянальнай) цацкай.

***Першы этап*** **(падрыхтоўчы)** прадугледжвае азнаямленне дзяцей малодшай і сярэдняй груп з творамі беларускага народнага мастацтва, вераваннямі і звычаямі беларускага народа, звязаных з народнай цацкай, стымуляванне жадання займацца мастацкай творчасцю з пераймannем лепшых традыцый народных майстроў Беларусі. Асноўнымі формамі работы на дадзеным этапе з'яўляюцца інтэграваныя заняткі, якія ўключаюць разглядванне цацкі і раказванне фальклорнага твора.

Для вырашэння пастаўленых задач мэтазгодна праводзіць гутаркі пра стварэнне народнай цацкі, пра яе сімвалічны сэнс; дыдактычныя гульні: «Спытай - даведаешся», «Закончы апавяданне пра цацку», «Загадай - адгадай»; заняткі па выяўленчай дзейнасці выхаванцаў старэйшага ўзросту (тэматычнае маляванне, стварэнне ілюстрацый да легенд, казак, замалёўкі старадаўніх цацак).

***Другі этап*** **(практычна - дзейнасны**) стварае ўмовы для мэтанакіраванага фарміравання творчай актыўнасці выхаванцаў, авалодання традыцыйнымі прыёмамі вырабу беларускіх народных цацак з улікам іх этнічных асаблівасцей. З гэтай мэтай прапануюцца заняткі па тэмах «Прыгажуны-птушкі», «Упрыгожваем калыскі», «Вучымся ў майстроў-цацачнікаў», «Народныя лялькі з тканіны»,«Цацкі-птушкі з цеста»,«Прыгожая вопратка ў лялькі».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На другім этапе ажыццяўляецца ўзаемасувязь метадаў і прыёмаў рэпрадуктыўнага і пошукавага характару. Асноўнымі метадамі работы выступаюць: мастацкія апавяданні пра жыццё народных майстроў і іх творчыя дасягненні; змястоўныя зносіны з майстрамі народнай цацкі, наведванне іх майстэрняў; навучанне традыцыйным прыёмам вырабу беларускіх народных цацак, азнаямленне з асноўнымі элементамі роспісу і да т.п.

Вельмі плённым з'яўляецца непасрэдны ўдзел дзяцей у вырабе тых ці іншых рукатворных цацак з гліны, саломы і іншых прыродных матэрыялаў. Работа з гэтымі матэрыяламі развівае працоўныя навыкі і творчыя здольнасці дзяцей, абуджае фантазію і ініцыятыву, садзейнічае развіццю лагічнага і вобразнага мыслення, эстэтычных адносін да зместу сваёй дзейнасці, праяўленню цікавасці да народнай культуры (Я.М. Сахута). Сказанае складае змест ***трэцяга* (творчага) *этапа,* нацэленага на непасрэднае праяўленне творчай актыўнасці** дзяцей на аснове вывучэння мастацтва беларускай народнай цацкі. Ён заахвочвае да выбару адпаведных варыянтаў у ходзе творчага працэсу, патрабуе забеспячэння максімальнай самастойнасці дзяцей ва ўвасабленні мастацкай задумы.

***Трэці этап можа*** складацца з цыклу заняткаў, накіраваных на стварэнне самастойных мастацкіх прац і правядзення Свята беларускай народнай цацкі. Дзецям прапануецца самастойна зрабіць самастойныя вырабы па матывах беларускіх народных цацак (падарункаў, сувеніраў, герояў лялечных спяктакляў); скласці казкі, аповяды аб персанажах беларускіх народных цацак; зрабіць ілюстрацыі ўласных літаратурных твораў, інсцэніроўку з выкарыстаннем самастойна створаных цацак па матывах беларускіх народных казак.

Пашыраць уяўленні дзяцей пра вытокі, асаблівасці, творчыя дасягненні майстроў народнай цацкі даюць магчымасць экскурсіі ў музей або выставу народнай цацкі --«Адкуль цацка да нас прыйшла», сустрэчы з народнымі майстрамі -- «У гасцях у майстроў-цацачнікаў», прагляды адпаведных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дыяфільмаў, альбомаў, рэпрадукцый. Такім чынам, па меркаванні даследчыкаў,эфектыўнае выкарыстанне народнай цацкі як сродку фарміравання ў выхаванцаў элементаў нацыянальнай культуры, магчымае пры захаванні наступных умоў:

•папаўненне развіццёвага асяроддзя групы рознымі відамі народнай цацкі;

•практычная дзейнасць дзяцей па засваенні ведаў і навыкаў вырабу і ўпрыгожвання народнай  цацкі;

•сумесная праца педагога з бацькамі: індывідуальныя і групавыя кансультацыі, правядзенне майстар-класу па вырабу і ўпрыжгожванні народнай цацкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ